

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№109 (1125) 14 чэрвеня 1995 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 541649 экз. Кошт у розніцу — 450 руб.

III Нацыянальнаму фестывалю беларускай песні і паэзіі

Дарагія сябры!

Сардэчна вітаю ўдзельнікаў III Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі, які традыцыйна праходзіць на нашай зямлі і збірае лепшыя творчыя сілы Рэспублікі Беларусь.

Глыбокі лірызм, задушэўнасць, шчырасць, патрыятычны ўздым сталі спадарожнікамі гэтага фестывалю. Яго паэтычнае слова і музыка хвалююць сэрцы, напаўняюць рэчаіснасць асаблівым духоўным святлом і прыгажосцю.

Жадаю ўдзельнікам фестывалю вялікага плёну, новых мастацкіх здзяйсненняў, высокіх творчых дасягненняў на карысць развіцця нацыянальнай культуры і ўзбагачэння духоўнасці беларускага народа.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А.ЛУКАШЭНКА.




Учора ў канцэртнай зале "Мінск" пачаўся III Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. Два першыя праславілі горад Маладзечна, а зараз славу самага песеннага горада захацела займець сталіца.

Таццяна Воранава ўдзельнічала ў першых двух фестывалях спачатку як госця, а потым як канкурсантка (у мінулым годзе яна заняла другое месца).

Цяпер Таццяна — салістка знакамітага аркестра Міхася Фінберга, і ўчора яна праспявала тры песні ("Не пытайся, маці", "Зорная ноч" і "Ты не чакай мяне") ужо не ў якасці шукальніцы поспеху, а як маладая "зорка".

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Вкратце

В ближайшее время федеральные войска в Чечне приступят к штурму Шатоя — одного из наиболее укрепленных дудаевскими формированиями населенных пунктов.

Как сообщил представитель командования Объединенной группировки федеральных войск, сейчас российские подразделения "ведут боевые действия уже в непосредственной близости от Шатоя". Он также отметил, что войска, как и при освобождении Ведено, высадили десантно-штурмовые группы в тыл боевикам.

❑

130 боевиков уничтожили федеральные войска в минувшие сутки в Чечне, сообщил представитель федерального командования.

Подразделения министерства обороны потеряли 2 человека убитыми и 10 ранеными. По данным командования, среди военнослужащих внутренних войск убитых нет, трое ранены.

❑

Около 1200 человек в разрушенном землетрясением городе Нефтегорске получили на сегодняшний день государственную компенсацию на общую сумму 4,136 млрд. рублей.

За время проведения аварийно-спасательных работ из-под завалов извлечено 2247 человек, из них погибших — 1841 человек. В живых осталось 406 человек, в том числе 40 детей. В настоящее время работы по разборке завалов завершены.

❑

Курс российского рубля на торгах Московской межбанковской валютной биржи 13 июня вырос на 45 пунктов по сравнению с торгами в пятницу и составил 4836 рублей за доллар.

Долг оппозиции — образумить коллег

Заместитель председателя Белорусского народного фронта Юрий Хадыко считает, что оппозиция БНФ в Верховном Совете должна принять участие в работе сессии парламента старого созыва 14 июня.

Аргументируя по просьбе корреспондента агентства РИД свою точку зрения, Ю.Хадыко, в частности, сказал: "На мой взгляд, в данной ситуации мы должны исходить не из обиды на исполнительную власть за ее действия 12 апреля, а из политической целесообразности, конкретнее — попытаться предотвратить возможные антиконституционные изменения в Законе о выборах и вновь предложить Верховному Совету свой проект избирательного закона, отвергнутый им ранее. Наш закон о выборах не только гарантирует избрание парламента уже после первого тура голосования, но и учитывает наличие многопартийности в стране. Если же останется в силе нынешний избирательный закон, даже две трети депутатов от их общего количества никогда не будет избрано". По мнению Ю.Хадыко, расчет членов оппозиции на то, что 14 июня Верховный Совет в их отсутствие не наберет кворума и, следовательно, не будет правомочен принимать какие-либо решения, безоснователен. "Недавнее решение Президиума Верховного Совета не выплачивать зарплату тем депутатам, которые не явятся на его заседание 14 июня, — довольно серьезная угроза для народных избранников. Следовательно, кворум 14 июня — даже без оппозиции БНФ — скорее всего, будет. Более того, могут быть приняты самые нелепые решения. Поэтому первейший долг оппозиции — принять участие в работе сессии и попытаться призвать остальных депутатов к здравому смыслу, правовому решению сложившейся кризисной ситуации", — подчеркнул Ю.Хадыко.

Александр ПАТУТИН.

Косим засучив рукава

С опережением прошлогодних темпов (разница в 6 тыс. га) хозяйства Беларуси продолжают первый укос трав.

По последним оперативным данным Минсельхозпрода, в целом по стране уже убрано 169 тыс. га площадей. Кошение ведется во всех областях. Наибольший показатель — в Брестской (17%) области, далее следуют Гомельская (9%), Гродненская (9%), Минская (более 7%), Могилевская (6%), Витебская (1,5%). В хозяйствах уже заготовлено 11 тысяч тонн сена, 253 тысячи тонн сенажа, 146 тысяч тонн силоса.

Сергей РАСОЛЬКО.

Дети бегут опасности навстречу...

С наступлением летнего сезона на дорогах отмечается рост числа дорожно-транспортных происшествий, в том числе с участием детей.

Так, за минувшую неделю на Минщине произошло 30 ДТП (3 — по вине "хмельных" водителей), в которых 10 человек погибло, 31 получил серьезные травмы. 7 июня в 5.30 водитель автомобиля "Форд-сьерра", гражданин Литвы, не справившись с управлением на перекрестке в Молодечно, съехал в кювет и ударился в придорожное дерево. Водитель и трое пассажиров скончались на месте, еще один пассажир госпитализирован в тяжелом состоянии.

В тот же день в 13 часов аналогичное происшествие было зарегистрировано с водителем автомашины ВАЗ-2105 недалеко от деревни Кривая Гряда Слуцкого района. Машина опрокинулась, два пассажира скончались на месте. 11 июня в 11.00 в деревне Погодица Борисовского района водитель автомашины ГАЗ-53 совершил наезд на девочку 1988 года рождения, оставленную без присмотра и перебегавшую дорогу. Ребенок госпитализирован.

Сергей РАСОЛЬКО.

Разбился и сгорел самолет

11 июня в 21.34 при посадке на асфальтированную дорогу потерпел аварию и загорелся спортивный самолет, принадлежащий Гродненской ассоциации общества авиалюбителей.

Как стало известно агентству РИД, самолет сгорел полностью, летчик получил ожоги первой и второй степени и был доставлен в больницу "скорой помощи".

Татьяна ЗАГВОЗДКИНА.

Чернобыльские свиньи — не сказка?

В Чечерском районе в общественных хозяйствах и на личных подворьях отмечены случаи рождения совершенно голых, без единой шерстинки поросят.

По словам главного зоотехника райсельхозпрода Николая Гапеенко, ни одна из таких особей не выжила. Специалисты гадают о причине столь загадочного явления. Наиболее вероятной является та, что район находится в зоне сильного радиационного загрязнения. Впрочем, все это только предположения.

Тимофей ВОРОНА.

Политиками не рождаются — их делают

6—8 июля Минский международный образовательный центр (ММОЦ) при поддержке фонда Эберта (Германия) проводит семинар для молодых политиков "Опыт политического сотрудничества в рамках Европейского сообщества".

Основная цель семинара — способствовать формированию в Республике Беларусь нового поколения политиков. По словам референта ММОЦ Александра Шевчука, белорусские партии, даже наиболее влиятельные, уделяют слишком мало внимания подготовке молодых кадров, что значительно затрудняет процесс обновления их состава. Темами, с которыми перед участниками семинара — молодыми представителями политических организаций как левой, так и правой ориентации — выступят отечественные и зарубежные ученые, политики, общественные деятели, станут проблемы европейской безопасности, роли и места Беларуси в Европе, ее интеграции в Европейское сообщество, вопросы молодежной политики.

Александр ПАТУТИН.

Какие мы?

Как известно, Беларусь по праву считается тихой, мирной страной. Однако так ли уж мирно настроены друг к другу наши соотечественники?

Ответить на этот вопрос попытались сотрудники Могилевского областного социологического центра. Было опрошено 1160 человек. Оказалось, что 22,2 процента жителей области допускают возможность своего личного участия в митингах протеста, 17,1 процента готовы бастовать, 14,1 процента внесут свою лепту в проведение несанкционированных демонстраций, 2,1 процента могут участвовать в голодовках протеста, а 6,3 процента готовы отстаивать свои взгляды с оружием в руках. Причем взяться за оружие готовы 10 процентов мужчин и 2 процента женщин. Среди сторонников решать личные и общественные проблемы вооруженным путем 20 процентов — люди в возрасте до 20 лет, 8 процентов — от 20 до 30 лет и 7 процентов — 30-летние.

Петр ПУШИНСКИЙ.

Курс валют

С 14 июня 1995 года Национальным банком установлены курсы иностранных валют

	Единый курс
1 австралийск. доллар	8261,49
1 австр. шиллинг	1170,30
1 фунт стерлингов	18376,48
10 бельг. франков	4003,90
1 немецкая марка	8228,98
1 голланд. гульден	7356,23
1 датская крона	2105,26
100 итальянск. лир	6906,90
1 канадск. доллар	8336,96
1 норвежск. крона	1848,28
1 доллар США	11500,00
1 финск. марка	2685,66
1 франц. франк	2337,49
1 шведск. крона	1588,99
1 швейцар. франк	9990,44
10 японских иен	1373,95
1 ЭКЮ	15171,50
10 испанск. песет	945,10
10 греч. драхм	508,44
1 ирландск. фунт	18806,21
1 исландск. крона	181,10
1 кувейт. динар	38513,06
10 ливанск. фунтов	70,86
10 португал. эскудо	781,25
1 сингапур. доллар	8258,53
10 турецк. лир	2,67
1 СДР	17918,91
1 эстонск. крона	1028,81
1 росс. рубль	2,36
10 укр. карбованцев	0,77
1 литовский лит	2875,00
1 латвийск. лат	22330,00
1 кыргызст. сом	1050,00
1 молдавск. лей	2520,00
1 казахст. тенге	150,00
1 армянск. драм	15,00
10 грузинск. купонов	0,01
1 туркменск. манат	55,00
1 азербайджан. манат	1,50
1 узбекский сум	45,00
1 таджикск. рубль	220,00
Курс клиринговых валют	
1 доллар США по расчетам с Кубой	11500,00
1 доллар США по расчетам с Чехией и Словакией	11500,00

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, РИД.

Службовая лесвіца

Быць намеснікам лягчэй

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь намеснікам міністра па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў назначаны Васіль Іванавіч Шаладонаў. Да нядаўняга часу ён з'яўляўся Генеральным пракурорам рэспублікі і ў сувязі з заявай аб адстаўцы вызвалены ад гэтых абавязкаў.

Да гэтай пары ў прэсу не паступіла канкрэтнай інфармацыі, якая б кампраметавала В.Шаладонава, хаця здагадак было шмат. І ніхто не сумняваўся, што Генеральнага пракурора трэба мяняць.

Рэктар без акадэміі

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за грубае парушэнне працоўных абавязкаў В.А.Сакалоў вызвалены ад абавязкаў рэктара Акадэміі фізічнага выхавання і спорту.

У скупым паведамленні Белінфарма няма ніякіх падрабязнасцей аб тым, за якія канкрэтна парушэнні вызвалены рэктар. У свой час В.Сакалова пазбаўляла пасады высокае спартыўнае начальства. Тады ён не згадзіўся з пакараннем і падаў іск у Ленінскі раённы суд.

Суд знайшоў звальненне няправільным.

У адміністрацыі Прэзідэнта, відаць, знайшлі новыя доказы.

Васіль ХАДАСЕВІЧ.

Витебск выбирает Троицу

Выборам в местные органы власти большинство жителей Витебска предпочло праздник Святой Троицы. Ну, а потом — какие уж там выборы?

Словом, из 45 округов отличился один, основная масса избирателей которого сосредоточена в загородном рабочем поселке Руба, где все так или иначе связаны с производственным объединением "Доломит". Именно там и определился единственный, можно сказать, "абсолютный" депутат горсовета — начальник цеха объединения Вадим Драке.

Теперь в Витебске есть два депутата: парламентарий Владимир Григорьев, генеральный директор "Доломита", и его сослуживец...

Выборы областного масштаба оказались более успешными. Они состоялись в 56 из 100 округов, но принесли мандаты только 38 претендентам. Самый известный среди "финалистов" первого тура — депутат "старого" Верховного Совета и председатель областного Совета Владимир Кулаков.

И все-таки выборы провалены, чего и следовало ожидать от мероприятия, намеченного на день Святой Троицы. Жаль только работников окружных и участковых комиссий, потративших силы и время на явно безнадежное дело...

Сергей БУТКЕВИЧ.

"Утаймаваныя" цэны

У Беларускае інфармацыйнае агенцтва паступіла паведамленне з Міністэрства статыстыкі і аналізу, у якім, у прыватнасці, адзначаецца, што індэкс спажывецкіх цэн у маі склаў 103,4 працэнта, у тым ліку на харчовыя тавары — 102,8, нехарчовыя — 105,9, паслугі — 103,1 працэнта.

І ў першы тыдзень чэрвеня істотных змяненняў цэн не адбылося. У сярэднім па рэспубліцы прадукты харчавання падаражалі на 1,2 працэнта, нехарчовыя тавары і паслугі — на 0,6 працэнта. З 30 мая па 6 чэрвеня захоўвалася тэндэнцыя росту цэн на муку — 2,0 працэнта і адпаведна на мучныя вырабы, а таксама на некаторыя віды малочных прадуктаў. На 14 працэнтаў падаражала гарэлка. Але ў той жа час масла стала таннейшым на 5,9, алей — на 3,2 працэнта. Паступова пачынае таннець агародніна.

А вось тым, хто любіць наведваць кінатэатры ў вячэрні час, за білеты прыходзіцца плаціць больш на 44,7 працэнта.

Аляксандр ВАЛАВОЙ,
Белінфарм.

11 июня 1995 года после тяжелой продолжительной болезни скончался бывший первый заместитель главного редактора газеты "Белорусская нива" Михаил Владимирович ВЫРВИЧ. Перестало биться беспокойное сердце журналиста, всю жизнь отдавшего служению родному народу на ниве культуры.

Михаил Владимирович Вырвич родился 7 декабря 1932 года в городском поселке Мядель в семье крестьянина-бедняка. В 1956—1960 годах он работал в мядельской "районке" ответственным секретарем, заместителем редактора, а в 1964 году, после окончания Минской высшей партийной школы, возглавил редакционный коллектив газеты, которая к тому времени стала называться "Нарачанская зара".

Новый и, несомненно, наиболее плодотворный период в журналистской судьбе М.Вырвича связан с его работой в "Сельской газете" — "Белорусской ниве", куда он пришел в 1979 году. Будучи заместителем, первым заместителем главного редактора белорусской крестьянской газеты, он вел большую организаторскую и творческую деятельность, много сил и внимания отдавал подготовке и воспитанию журналистских кадров.

До последних дней, будучи уже тяжело больным, М.Вырвич оставался в редакционном строю, живо интересовался делами и заботами родного коллектива.

В нашей памяти навсегда сохранится светлый образ Михаила Владимировича Вырвича — талантливого журналиста, умелого организатора, доброго и мужественного человека.

ЛУКАШЕНКО А.Г., ЧИГИРЬ М.Н., СИНИЦЫН Л.Г., РУСАКЕВИЧ В.В., ГАРКУН В.Г., БУТЕВИЧ А.И., ЛЕОНОВ В.С., ЗАМЕТАЛИН В.П., ШИМАНСКИЙ М.В., ЛЕГАНЬКОВ В.Ф., СТРЯПЧИЙ А.И., ЗАХАРЧУК В.П., АЛЕКСЕЙЧИК Я.Я., ГАЛКО Н.А., НАРКЕВИЧ В.Б., ДУБОВИК С.В., ЯКУБОВИЧ П.И., ГУКОВСКИЙ И.А., БЕЛЬСКИЙ В.П., ШЛОМА Н.А., ЕКЕЛЬ Л.С., КОЛОС А.Д., ТОЛКАЧ Л.К., ДУБКО А.И., ЮНЦЕВИЧ А.В., ИВАНОВ С.А., ШАРЕЦКИЙ С.Г., НОВИКОВ В.Н.

Палітыкі пра сітуацыю дня

Юрый КУЛАКОЎСКІ, дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання:

"Паслабленне трэба. Але толькі сёння"

Вельмі хацеў бы, каб новы Вярхоўны Савет пачаў працаваць. Але не таму, што асабіста я абраны дэпутатам. Сёння як ніколі патрэбна канструктыўная работа заканадаўчай галіны ўлады.

Што датычыцца нечарговай сесіі, дык яе трэба збіраць і неадкладна ўдасканальваць заканадаўства. Каб пераадолець палітычны крызіс, а менавіта так можна ахарактарызаваць цяперашнюю сітуацыю ў рэспубліцы, неабходна ўвесці кворум дзве пятых — гэта патрэба сённяшняга дня. А ўвогуле я супраць усялякіх паслабленняў. Падпраўленнем законаў пад "змену надвор'я" нічым, як юрыдычным нонсенсам, назваць немагчыма. Нам і без таго хапае казусаў.

Пра пазаўчарашнюю нараду. Не паехаў па адной прычыне: не хацеў сваёй прысутнасцю ствараць імідж цяперашняму Старшыні Вярхоўнага Савета. Нас, новых выбраннікаў народа, павінен быў склікаць на гэтую сустрэчу старшыня Цэнтрвыбаркама Абрамовіч, а не Грыб. Палітычных гульняў мы ўжо нагледзеліся.

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ, былы кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета, член Нацыянальнага камітэта Грамадзянскай партыі:

"Вярхоўны Савет павінен клапаціцца не аб паскарэнні работы новага парламента, а хутчэй аб яго легітымнасці, арганізацыі і правядзенні паўторных выбараў"

Не буду даваць прагнозы таму, як вырашыцца сёння пытанне на сесіі Вярхоўнага Савета, — гэта справа дэпутатаў, якія абяцалі людзям быць сумленнымі і прынцыповымі. Спадзяюся, што прыстойнасць і здаровы сэнс перамогуць. Але баюся, што наш парламент (ужо каторы раз!) можа прыняць рашэнне, якое задаволіць толькі "народных выбраннікаў": вельмі ж яны добра навучыліся падладжваць пад сябе любыя законы. Турбуе больш за ўсё тое, што яны заўсёды гатовы апраўдаць і часта апраўдваюць свае антыканстытуцыйныя дзеянні. Гэта ўвайшло, на жаль, у практыку работы ўладных структур. Такое ўражанне, што ў іх сваё жыццё, а ў народа — сваё. Які прыклад яны, заканатворцы, часта паказваюць тым, хто на месцах павінен "блюсці" законы, пастановы? Ці не таму ў нашай краіне пашыраюцца праўвавыя самавольствы, якія заганяюць народ у жабрацтва на фоне ўсёдазволенасці мясцовага начальства? Няўжо і новы парламент будзе дзейнічаць такім жа чынам? Час пакажа. Але тое, што новыя дэпутаты амаль усе прамаўчалі на сустрэчы ў Вярхоўным Савеце, пра многае гаворыць. Мае землякі-выбаршчыкі не дадуць зманіць: мы з імі прадбачылі такую сітуацыю — новы парламент, які выбралі члены выбарчых камісій са скрынкамі і мясцовае начальства з удзелам народа, будзе зыходзіць з карпаратыўных, ідэалагічных інтарэсаў, а не дзяржаўных. Маўчанне на сустрэчы, дзе абмяркоўваўся выхад з крызіснай сітуацыі, — таксама, пагадзіцеся, пазіцыя. Больш таго, хвалюе аднадушнасць у паводзінах новых дэпутатаў, якая мае перспектыву перарасці ў канфрантацыю з выканаўчай уладай. А гэтага мы ўжо наеліся. Народ усё ж спадзяецца на супрацоўніцтва ўсіх галін улады дзеля лепшай будучыні нашай дзяржавы. Буду рады, калі памылюся ў сваіх прагнозах.

Здзіўляе прапанова Камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, згодна з якой Вярхоўны Савет лічыўся б правамоцным, у які абрана 1/2 дэпутацкага корпуса, і аб правядзенні выбараў 4 кастрычніка. Няўжо так закабінеціліся, так адарваліся ад жыцця ініцыятары гэтай прапановы? Адбудзецца тое, што было ў красавіку—маі: людзі будуць працаваць на прысядзібных участках, дачах. Таму зноў мала хто прыме ўдзел у выбарах. Ці, можа, такое камусьці трэба — зрыў паўторных выбараў?

Нельга паглыбляць крызіс улады. Праўда, дзеючы Закон аб выбарах, які прадугледжвае яўку не менш чым 50 працэнтаў выбаршчыкаў, вядзе менавіта да гэтага. Відавочна, што на працягу значнага перыяду ў склад новага парламента не будуць выбраны дзве трэці ад агульнай колькасці дэпутатаў і ён не будзе мець права на прыняцце заканадаўчых актаў.

У цывілізаваных дэмакратычных краінах свету, дзе дзейнічае мажарытарная выбарчая сістэма (ЗША, Англія, Францыя, Японія, Канада і г.д.), выкарыстоўваецца права адноснай большасці, калі для перамогі на выбарах дастаткова перавагі ў адзін голас, незалежна ад колькасці выбаршчыкаў, якія прыйшлі да выбарчых урнаў.

Нацыянальны камітэт Грамадзянскай партыі звярнуўся ў Вярхоўны Савет з прапановай унесці папраўкі ў Закон аб выбарах, якія здымаюць абавязковы мінімум яўкі выбаршчыкаў ці ўводзячыя абавязковае галасаванне. Гэта папярэдзіць пагрозу крызісу ўлады і магчымыя абвінавачванні ў фальсіфікацыі вынікаў выбараў. Мэтазгодна ў цяперашніх умовах прадаставіць кожнай палітычнай партыі, якая ўдзельнічае ў выбарах, права доступу і вывучэння ўсіх матэрыялаў участковых і акруговых камісій па выбарах дэпутатаў не больш чым у пяці акругах і ў дзесяцідзённы тэрмін пасля дня галасавання.

Лічу, што Вярхоўны Савет павінен клапаціцца не аб паскарэнні работы новага парламента, а хутчэй аб яго легітымнасці, арганізацыі і правядзенні сапраўды дэмакратычных выбараў у канцы лістапада. Магчыма, 29-га чысла.

Адам АСТАША.

З завязанымі вачамі і спутанымі нагамі на баксёрскім рынгу перамагчы нельга!

З лідэрам Беларускага народнага фронту Зянонам Пазьняком гутарыць аглядальнік "Народнай газеты" Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ

— У сродках масавай інфармацыі, а таксама з вуснаў некаторых палітыкаў і дзяржаўных дзеячаў прагучала, што Беларускі народны фронт пацярпеў на выбарах сакрушальнае паражэнне. Вы згодны з такой ацэнкай? І наогул, чаму, на вашу думку, ніводзін прадстаўнік БНФ не стаў дэпутатам?

— У тых антыдэмакратычных, крымінальных умовах, у якіх адбываліся так званыя выбары, кіруючы рэжым поўнасцю "перамог" Народны фронт. Дакладней, аўтарытарны рэжым перамог дэмакратыю. Не прайшоў ні адзін кандыдат ад БНФ, больш таго, заблакіраваныя ўсе кандыдаты ад дэмакратычных партый, не адбыліся выбары ў Мінску і ў вялікіх гарадах. Прапусцілі толькі 119 дэпутатаў з 260 — у асноўным старшынь калгасаў. Новы парламент не выбраны. Стары Вярхоўны Савет, наменклатурная большасць якога падтрымала прэзідэнцкі путч 12 красавіка і сілай расправілася з апазіцыяй, дэмаралізаваны. Ну чым не "сакрушальная перамога" рэжыму ды яшчэ і пад чырвоным бальшавіцкім сцягам, які зноў пераможна развяваецца над Домам урада і былым будынкам ЦК КПБ? Цяпер толькі кіруй і вядзі ў светлую будучыню.

Паражэнне можна пацярпець на дэмакратычных выбарах, калі выконваюцца законы, паважаюцца дэмакратычныя нормы, правы чалавека, свабода інфармацыі, Канстытуцыя і тым самым ствараюцца роўныя ўмовы для ўсіх, а выканаўчая ўлада не ўмешваецца ў выбарчы працэс. Калі вам, напрыклад, завязаць вочы і, спутаўшы ногі, выпусціць на баксёрскі рынг, вы вядома ж прайграеце. Калі сродкі масавай інфармацыі сканцэнтраваны ў руках кіруючай прэзідэнцкай групы, а выканаўчая ўлада вытварае што захоча, тады перамагае адзін кіруючы рэжым, прадаўжаючы тым самым дзяржаўны пераварот. Тыя, што яго зрабілі і робяць, спрыяюць захопу Беларусі Расіяй, знішчаюць наш суверэнітэт, падрываюць асновы дзяржавы.

— Ці паўздзейнічалі на вынікі выбараў рэферэндум і тыя прапагандысцкія акцыі, якія праводзіла прэзідэнцкая каманда, як, напрыклад, фільм "Нянавісць"?

— Мяркую, што асаблівага ўздзеяння на выбары рэферэндум не меў, хоць пэўным чынам актывізаваў камуністычныя і антыбеларускія колы. Вялікі ўплыў на вынікі выбараў зрабіла афіцыёзная прапагандысцкая палітыка хлусні, накіраваная супраць Народнага фронту (фільм "Нянавісць", выступы Прэзідэнта па тэлебачанні па тры гадзіны ў эфіры і г.д.). Частка той паловы насельніцтва, што не вызначылася, ці знаходзіцца ў стане апатыі, бязвер'я, абыякавасці, ці якая "ні за каго", пасля прагляду фільма прагаласавала супраць кандыдатаў Народнага фронту. Уласна кажучы, цвёрды электарат Народнага фронту і камуністаў ужо вызначаны. Гэта ў сярэднім па 20 працэнтаў з аднаго і другога боку. У дэмакратычных, роўных умовах змаганне павінна было б ісці якраз за галасы астатніх 60 працэнтаў выбаршчыкаў. Ва ўмовах, што склаліся на Беларусі, рэжым забяспечыў аднабаковую перавагу камуністам, "вертыкальшчыкам" і старшыням калгасаў.

— Які, на ваш погляд, зараз існуе законны выхад з таго палітычнага тупіка, у якім апынулася Беларусь?

— Выконваць Канстытуцыю, законы, ажыццявіць фінансава-крэдытную і эканамічныя рэформы і, галоўнае, праводзіць унутраную і знешнюю палітыку зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў беларускай дзяржавы.

— А як будзе дзейнічаць БНФ?

— На апошніх соймах БНФ і партыі БНФ 10 чэрвеня былі падрабязна разгледжаны і прадыскутаваны задачы арганізацыі ва ўмовах недэмакратычнага аўтарытарнага існавання.

Стратэгія застаецца нязменнай. Гэта — Адраджэнне. У практычнай дзейнасці галоўная ўвага будзе звернута на злучэнне ўсіх здаровых палітычных сіл Беларусі, якія стаяць на грунце незалежнай дзяржавы. Трэба ратаваць Бацькаўшчыну. Неабходна будзе прарваць інфармацыйную блакаду шляхам аб'яднання пэўных беларускіх палітычных элітаў. На ніжэйшых узроўнях прапанаваны кантактны падыход да людзей, прадугледжана арганізацыйнае ажыўленне сатэлітных структур. Мяркуецца таксама ўмацаваць арганізацыйнае ядро БНФ, выкарыстаўшы партыйны "парасон". Асаблівая ўвага будзе таксама звернута на дэмакратычную салідарнасць з дэмакратамі ўсіх зацікаўленых краін.

Новая задача, якая заканамерна ўзнікла пасля ўсталявання рэжыму і перамогі яго на выбарах, — прадухіленне расколу ў шэрагах БНФ, утварэння амбіцыёзных груп, дзейнасці агентуры ўлады, апатыі, дэзарыентацыі і гэтак далей.

Народная газета

СТАЛО ИЗВЕСТНО

Оказывается, живем мы хорошо

Уровень жизни в России ниже, чем в Беларуси, но зато значительно выше, чем на Украине. Такой вывод следует из опубликованного ежегодного доклада ЮНИСЕФ "Прогресс наций в 1995 году".

На одного жителя России, согласно докладу, приходилось в 1993 году в среднем 2350 долларов валового национального продукта, в Беларуси — 2840 долларов, а на Украине — 1910 долларов. Братья-славяне, однако, лучше всех живут в Словении, где на одного "среднестатистического" жителя приходилось 6310 долларов. Это самый высокий уровень жизни из всех 27 государств, официально относимых к странам с переходной экономикой.

Беларусь занимает в этой группе стран 4-е место, уступая Словении, Венгрии, Эстонии, но обогнав при этом Россию, Чехию и Польшу.

Журнал о Бахтине и не только

Грант от Белорусского фонда Сороса получил в качестве финансовой поддержки витебский издатель доцент пединститута Николай Паньков, являющийся редактором уникального журнала "Диалог. Карнавал. Хронотоп", посвященного блестящему философу, теоретику и историку литературы, искусствоведу Михаилу Бахтину, который жил и работал в Витебске в 20-х годах.

Периодическое издание (с 1992 года вышло уже 10 номеров) внесено в библиотечные каталоги университетов мира, его выписывают и читают ученые многих стран, где творчество Михаила Бахтина ценится чрезвычайно высоко. Витебский журнал публикует материалы об эпохе Бахтина, его биографии, теоретические труды ученого и его последователей, современные "бахтиноведы". Николай Паньков считает избранную им тему неисчерпаемой в отличие от средств на выпуск журнала, а потому и не отказывается от спонсорской помощи. В ближайших номерах издатель рассчитывает поместить эксклюзивные интервью с Иосифом Бродским и Александром Солженицыным.

Сергей БУТКЕВИЧ.

З жыцця наменклатуры

Дзень, калі не ўсплыла рыба

Іван ГЕРАСЮК

Наменклатура — гэта кола кіруючых асоб, якіх прызначае на пасады вышэйстаячае начальства, а не выбірае народ. Таму і задача ў яе адна: выслужыцца перад сваімі "босамі", падлізацца, "падмазаць", "падаслацца" і г.д. За гады існавання кадравых спісаў N 1 і N 2 спосабаў вынайдзена мноства. Наменклатура жыла, жыве і будзе жыць па сваіх асобых правілах, але заўсёды на поўную губу і за кошт тых, хто гне спіну на гэтую самую наменклатуру.

Доўгі час "рыбную наменклатуру" ў рэспубліцы ўзначальваў М.Данскі. Зразумела, яна была толькі кольцам у густым павуцінні, нітачкі якога час ад часу пацягваў таўсматы павук з ЦК КПБ. Колькі чорных лімузінаў перабывала ля рыбкамбіната "Нарач", дзе наменклатурныя чэравы выбіралі для сябе судакоў ці вугроў! А колькі пасвілася іх у іншых рыбгасах!

Ішоў час. Нібыта памянялася ўлада, але норавы наменклатуры не мяняліся. Інакш і быць не магло — "знаёмыя ўсё тварыкі". Непарушна сядзеў у сваім крэсле і М.Данскі. У апошнія гады асабліва даспадобы прыйшоўся яму вопыт польскага прадстаўніцтва бельгійскай прыватнай фірмы "Габрыэль", куды ён і ездзіў за штосьці яго выменьваць. За 1992—1994 гг. рэспубліканскае рыбнае аб'яднанне выкарыстала на камандзіроўкі 10.720 нямецкіх марак і 9.133 долары ЗША. Які ж вопыт з пакоя гатэля (з дасведчаных крыніц вядома, што прадстаўніцтва фірмы мясцілася менавіта там) прывёз на Беларусь М.Данскі? Гэта невядома. Затое дакладна вядома, што нязменнай яго спадарожніцай у гэтых ваяжах была памочніца генеральнага дырэктара С.Храпіцкая. У чым жа яна дапамагала яму з такім зайздросным пастаянствам? Калі б ездзілі тэхнолагі ці рыбаводы, тады зразумела. Іншыя ж спецыялісты за мяжой амаль не бывалі.

Асабліва цікавай атрымалася камандзіроўка ў студзені 1994 года, калі ад'язджаючыя атрымалі 5.625 долараў ЗША, але нікуды не паехалі. Долары ў касу аб'яднання ніхто не вяртаў, і толькі ў лістападзе чамусьці адзін М.Данскі аддаў аб'яднанню 3.750 долараў і нарэшце-такі пайшоў на заслужаны адпачынак. Здаецца мне, што нават начальнік перад звальненнем павінен разлічыцца з усімі даўгамі і падпісаць так званы "абходны ліст". Аднак галоўны бухгалтар Г.Ціхамай усе гэтыя месяцы пра даўжок нават не заікнуўся. Калі 5.625 долараў укласці ў справу нават усяго пад 10 працэнтаў, то праз 10 месяцаў можна атрымаць яшчэ столькі ж чыстага навару. Потым, ужо ў 1995 годзе, М.Данскі, відаць, са сваіх пенсіённых даходаў заплаціў яшчэ 1.875 долараў.

Як падлічылі спецыялісты Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, страты і ўпушчаная выгада аб'яднання "Дзяржрыбгас" складаюць на сённяшні дзень 1.335,7 мільёна рублёў, 3.142 нямецкіх маркі і 538 долараў ЗША.

Здзіўляцца тут няма чаго, бо ў аб'яднанні панавалі дзіўныя норавы. Па аднаму тэлефоннаму званку генеральнага дырэктара падначаленыя рыбгасы аддавалі рыбу за валюту, але самі гэтай валюты і ў вочы не бачылі. Сядзелі ціхенька, як мышы пад венікам. І не рыпаліся. Відаць, выгадна было не рыпацца.

Ну, а куды ж ішла валюта? Якая была пільная патрэба абдзяляць сваіх людзей, якія і так свежай рыбы амаль не бачаць, і гнаць яе "Габрыэлю"? Можа, пра лекі, пра нашых хворых дзяцей клапаціліся? Пра развіццё вытворчасці, нарэшце?

Перш-наперш долары-марачкі трацілі на ўжо адзначаныя паездкі па запрашэнню польскага прадстаўніцтва фірмы, частку ўклалі ў камерцыйны банк, яшчэ за 11.800 марак купілі мікрааўтобус у прыватнага прадпрымальніка. Вось, па-сутнасці, і ўсё.

Калі бываеш на пасяджэннях савета Кантрольнай палаты, заўсёды хочацца задаць пытанне, але журналістам такое права не дадзена. Між тым цікава: а што гэта за прыватны прадпрымальнік і які гэта мікрааўтобус ён прадаў? І чаму галоўны бухгалтар так паблажліва не заўважае тысячы долараў, якія сплываюць з дзяржаўнай кішэні? Чаму гэта ён такі невідушчы?

Чым больш прыводзіцца розных апраўданняў, тым больш узнікае пытанняў. "Трэба разбірацца ў кожным канкрэтным выпадку. Вялікі аб'ём работы". Што вялікі, то вялікі. Залішне шмат у нас ласых да свежай рыбкі.

Дарэчы, да чужых грошай таксама. Незразумела, чаму аб'яднанне пералічвае вялікія сродкі дзяржаўнаму прадпрыемству, а потым іх вяртае нейкае таварыства з абмежаванай адказнасцю, пакарыстаўшыся беспрацэнтным крэдытам. Што гэта за ТАА? Якія яно мае адносіны да завода жалезабетонных вырабаў? Ціха. Не ўсплыла рыбка пасля праверкі — ні малая, ні вялікая.

А то ў першым паўгоддзі 1994 года савет аб'яднання вырашыў прыдбаць гарэлкі для сваіх супрацоўнікаў — такая версія. 138,5 мільёна рублёў пералічылі аб'яднанню "Мінскрухмалпрам". Во можна было б напіцца! І начальству, і рыбакам. Але ж не прыйшла гарэлка. Толькі праз некалькі месяцаў грошы вярнулі нейкая асацыяцыя "Тэхнабытсервіс" і фірма "Вераніка". Якія яны маюць адносіны да нашага гарэлкаробчага монстра? За якія ласкі такі беспрацэнтны крэдыт? Не ведае гэтага Кантрольная палата. А дарэмна.

Я ўжо не кажу, што нашы слаўныя рыбаводы куплялі і прадавалі машыны, тэлевізары, халадзільнікі ў той час, як рыбная гаспадарка рэспублікі прыходзіла ў заняпад. Праектныя тэрміны работ у рыбгаспадарках "Навасёлкі", "Навалукомльская", "Чырвоная Слабада" перавышаны ўдвая, інвестыцыі не складаюць і паловы ад неабходнага, а Савет аб'яднання з зайздроснай напорыстасцю амаль на кожным пасяджэнні разглядаў пытанні аб новых акладах, надбаўках, прэміях за замежныя камандзіроўкі (!) і нават аб выдзяленні матэрыяльнай дапамогі генеральнаму дырэктару на набыццё бульбы (бедны чалавек!).

Наменклатура жыве па сваіх правілах. Менавіта па гэтых правілах у 1990 годзе дырэктар рыбгаса "Чырвоная Слабада" В.Карніценка прадаў домік на тэрыторыі сажалак фірме "Лад" усяго за 4.400 рублёў. Потым нейкая камерцыйная "Дыяна" ўзяла ў арэнду 36 гектараў рыбгаса. Дамаўляліся нібыта, што камерсанты будуць здаваць рыбгасу 80 працэнтаў вырашчанай рыбы. Толькі ў першы год яны здалі 6,1 тоны з усёй сваёй вотчыны (у 4 разы менш, чым атрымліваюць звычайна ўсяго з 1 гектара). Астатняя рыба так нідзе і не ўсплыла. І чатыры наступныя гады яна больш ужо не ўсплывала з гэтага камерцыйнага запаведніка. Затое вырас тут трохпавярховы церам з саўнай, з'явіліся вальеры для сабак і іншай жывёлы, узведзены будынкі для абслугі наменклатуры прэзідэнцкіх часоў.

Колькі лімузінаў перабачылі мясцовыя вартаўнікі, колькі наслухаліся паляўнічай страляніны! А колькі тут навараннa юшкі ды насмажана шашлыкоў! Зразумела, не для нейкай там чэрні пад назвай "беларускі народ". Усе чатыры гады назіраў гэта В.Карніценка і чамусьці "маўчаў у анучку".

Адкуль любоў такая ў нашых улад да "лад", "дыянаў", "валерыяў" і многіх-многіх іншых? Не ведае Кантрольная палата. Рыба так і не ўсплыла ў гэты дзень, 12 чэрвеня 1995 года, калі, здавалася, будуць пастаўлены ўсе кропкі над "і".

І не ўсплыве. Ва ўсякім выпадку да таго часу, пакуль будзе жыраваць у церамах наменклатура, пакуль будзе адпраўляць сябе разам з "памочніцамі" ў замежныя камандзіроўкі, распараджацца дзяржаўнымі доларамі, як сваімі, ды яшчэ і не вяртаць.

Думаю, нядрэнна было б Прэзідэнту Лукашэнку ды новаму генеральнаму дырэктару "Дзяржрыбгаса" Лукашэвічу завітаць на гадзінку ў запаведны куток, паглядзець, як жывуць людзі, "не мудрствуя лукаво". Цікава, што змянілася б пасля гэтага візіту?

ДА 95-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ МІХАЛА ЗАБЭЙДЫ-СУМІЦКАГА

Трохі пра вандроўкі спевака

"У Забэйды-Суміцкага адразу адчуваецца пяшчотная душа славянскага летуценнага паэта. Яго тонкая інтэрпрэтацыя захапляе слухачоў. Яго голас — гэта дасканалы інструмент, які здольны перадаць усе пачуцці, змешчаныя ў вершы, нават тады, калі ён спявае на чужой мове. Гэта пацвердзіла публіка сваімі апладысментамі. М.Забэйда — тэнар надзвычайнай якасці, голас мяккі, гнуткі, падобны голасу свайго суайчынніка Собінава..."

Так некалі захапляліся спеўным майстэрствам нашага земляка музыказнаўцы з Італіі, калі ён у 1934 г. спяваў на знакамітай сцэне Міланскай оперы.

Сын бедных сялян з вёскі Шчэпічы Пружанскага раёна, ён дзе самавукам, дзе з дапамогай добрых людзей дамогся сусветнай славы: некалі ягоны голас быў чутны ў Еўропе і Амерыцы.

Віхуры грамадзянскай вайны занеслі маладога Міхала ажно ў Харбін. Тут ён спярша працаваў настаўнікам, потым зноў вучыўся і закончыў на "выдатна" універсітэт. І раптам хлопец з Беларусі трапіў у тамтэйшы оперны тэатр. З таго часу музыка стала яго лёсам. Сабраўшы грошай, Міхал едзе ўдасканальваць сваё спеўнае майстэрства ў Мілан. Там і пазнаёміўся ён з сусветна вядомым спеваком Фернанда Карпіні, які раней спяваў з Каруза, і пачаў разам з ім спяваць на опернай сцэне. У Мілане Забэйда сустрэўся са славутым Собінавым і выканаў з ім некалькі канцэртаў.

Праз нейкі час Забэйда-Суміцкі пераехаў у Варшаву, дзе выконваў на опернай сцене не толькі вакальныя партыі, але і беларускія народныя песні. З таго часу Міхал Забэйда-Суміцкі стаў на чужыне першым прапагандыстам беларускага мастацтва. "Гэтыя канцэрты не абяцалі вялікай кар'еры, — пісаў пазней Міхал Забэйда, — але яшчэ больш збліжалі мяне з роднай песняй — песняй маёй маці, давалі магчымасць яе распаўсюджваць, несці ў свет, паказваць яе непаўторную красу, даваць людзям радасць і ўзбагачаць гэтай песняй сусветную культуру..."

Трохі пра адзіны канцэрт на радзіме

Мне пашчасціла некалі бачыць славутага спевака, чуць яго чароўны голас.

Тады, у 1961 годзе, я вучыўся на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта, а ў вольны ад заняткаў час хадзіў на рэпетыцыі ў студэнцкі хор. Нашым спеўным калектывам кіраваў славуты Рыгор Раманавіч Шырма.

Аднаго разу Рыгор Раманавіч прыйшоў на рэпетыцыю ў нейкім святочным і ўзнёслым настроі. Калі мы падрыхтаваліся развучваць новую песню, ён абвёў нас сваім бацькоўскім позіркам і ўрачыста-таямнічым голасам сказаў:

— Да нас з Прагі прыехаў на гастролі беларускі спявак Міхал Забэйда-Суміцкі. Спявак сусветнай славы. Я маю некалькі запрашальных білетаў на яго канцэрт у актавай зале кансерваторыі...

Пад канец гутаркі Рыгор Раманавіч прызнаўся:

— З Міхалам Іванавічам я знаёмы даўно. Яшчэ з Вільні. Гэта было пры польскім часе. Пасля кожнага канцэрта студэнты-беларусы выносілі яго з залы на руках.

— А тут, у Мінску, могуць і пад рукі вывесці, — нехта з нас няўдала пажартаваў.

Рыгор Раманавіч спахмурнеў і змоўк...

У той вечар пашчасціла: адно запрашэнне наш мастацкі кіраўнік прапанаваў мне.

Кансерваторская зала не змагла ўмясціць усіх, хто жадаў паслухаць голас знакамітага спевака. Не выклікала сумненняў, што ўлады знарок выбралі для канцэрта Забэйды-Суміцкага невялічкае памяшканне, каб туды трапіла абмежаванае кола людзей. Ды й сачыць за паводзінамі людзей было лягчэй.

Спяваў замежны артыст — госць на сваёй роднай зямлі — прачула і натхнёна сакавітым тэнарам. Яго рэпертуар быў насычаны арыямі з опер, чэшскімі і польскімі песнямі. Але асаблівую ўвагу і сваё спеўнае майстэрства ён аддаваў матчынай песні. Часта, спеўшы беларускую песню, даставаў з кішэні хустачку і прыкладаў да вачэй. Зала горача яму апладзіравала.

Па-майстэрску праспяваўшы "Зялёны дубочак", ён раптам звярнуўся да слухачоў:

— Вось мой акампаніятар, чэх, пахадзіў сёння па вуліцах Мінска, паслухаў, як тут людзі гавораць, і кажа мне: "Пан Міхал, я не ведаю, куды мы прыехалі на гастролі. У вашую Беларусь ці ў Расію? Тут жа ўсе гавораць па-расійску. Можа, мы памыліліся і не ў той цягнік ускочылі?.."

Зала пасля гэтых слоў сціхла, нібы замерла. Але ненадоўга. Хутка з першых крэслаў пачулася спярша злоснае, нібы вужачае, шыпенне, а затым цвёрды і рэзкі голас:

— В самом деле, вы сели не в тот поезд!

— И давно в нем едете! — падтрымаў яго з кута залы яшчэ адзін правакатар.

Прыхільнікаў таленту выдатнага спевака і патрыётаў Бацькаўшчыны, што сабраліся тут, нібы кіпнем абдала. Стала сорамна, балюча і крыўдна за тых людзей, якія прыйшлі сюды з заданнем абразіць, зняважыць спевака. Але Забэйда-Суміцкі не разгубіўся:

— Я еду ў правільным накірунку, да сваёй Радзімы. Гэта вы не туды прыехалі і спыніліся не на тым прыпынку. Заблудзіліся, панове!..

У адказ зала ўзарвалася апладысментамі.

Гэта быў апошні канцэрт спевака. Больш выступаць на Радзіме Міхалу не дазволілі... Яго больш не запрашалі ў Мінск. Не дазволілі нават прыехаць, каб памерці на Бацькаўшчыне.

Мікола КАПЫЛОВІЧ.

Сельскія кірмашы...

Дзе ж былая веліч іх?

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара

